| *Pieczątka szkoły* | *Kod ucznia* | *Liczba punktów* |
|---|---|---|
| | | |

**WOJEWÓDZKI KONKURS JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO**

**DLA UCZNIÓW GIMNAZJÓW**

**W ROKU SZKOLNYM 2017/2018**

***STOPIEŃ REJONOWY – 19.01.2018 r.***

1. Test konkursowy zawiera 13 zadań. Są to zadania zamknięte i otwarte. Na ich rozwiązanie masz 90 minut. Sprawdź, czy test jest kompletny.
2. Zanim udzielisz odpowiedzi, uważnie przeczytaj treść zadania.
3. Wszystkie odpowiedzi czytelnie i wyraźnie wpisuj w wyznaczonych miejscach.
4. Test wypełniaj długopisem, nie używaj korektora, ołówka ani gumki. Nie komunikuj się z innymi uczestnikami konkursu.
5. Przy rozwiązywaniu zadań zamkniętych wyboru wielokrotnego wybierz jedną, prawidłową odpowiedź i zaznacz ją krzyżykiem, np.:

   A  ~~B~~  B

   Jeżeli się pomylisz i zechcesz wybrać inną odpowiedź, to złe zaznaczenie otocz kółkiem (X), po czym skreśl właściwą literę, np.:

   A  (B)  ~~B~~

6. Sprawdź wszystkie odpowiedzi przed oddaniem testu.
7. Nie podpisuj testu, zostanie on zakodowany.
8. Brudnopis, dołączony do testu, nie podlega ocenie.

**Zadanie 1**. *(5 p.)*

Успомні апвяданне Максіма Багдановіча „Музыка” і на падставе яго адзнач правільны адказ.

1. Музыка іграў на:

А. скрыпцы

Б. дудцы

В. гуслях

2. Ігры музыкі баяліся:

А. бедныя людзі

Б. багатыя людзі

В. прырода

3. Мэтай ігры музыкі было:

А. развесяляць людзей

Б. засмучаць людзей

В. будзіць ад цяжкага сну

4. Жыццё музыкі скончылася, калі:

А. кінулі яго ў турму

Б. выгналі з краю

В. закапалі жыўцом у магіле

5. Пад постаццю музыкі можам падразумяваць:

А. сапраўдных музыкантаў

Б. пісьменнікаў

В. неадукаваных людзей.

**Zadanie 2.** *(5 p.)*

Якімі рысамі характару надзяліў Пятрусь Броўка беларусаў у вершы „Калі ласка?”. Назаві прынамсі пяць.

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: „Калі ласка!..”
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.
Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
- Калі ласка, калі ласка ў хату!
Не паспелі сесці пры сустрэчы,
Як патэльня засквірчэла ў печы,
Ды і чарка бліснула дарэчы.
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце, людцы, калі ласка!
Хлопец кажа дарагой дзяўчыне:
- Калі ласка! Будзеш гаспадыняй!..
Эх, жыццё збудуем мы прыгожа,
Усе з табой нягоды пераможам.
Гром грыміць. З нябёсамі размова:
- Калі ласка, цёплы дождж вясновы!
- І не вельмі буйны і не рэдкі –
На сады, на пушчы, на палеткі,
На грыбы, на ягады, на кветкі...
- Калі ласка! – наш зварот бясконцы.
Мы гаворым ранішняму сонцу;
- Калі ласка, сонца, выйдзі з хмары,
Радасцю аблашчы нашы твары,
Ты ўзнімі з сабою нашы мары!
- Калі ласка! – нашай роднай мовы
Шчырыя і ветлівыя словы.

- ……………………………………………………………………………………………
- ……………………………………………………………………………………………
- ……………………………………………………………………………………………
- ……………………………………………………………………………………………
- ……………………………………………………………………………………………

**Zadanie 3.** *(8 p.)*

Дапоўні сказы інфармацыямі пра Сакрата Яновіча.

Сакрат Яновіч гэта прадстаўнік літаратурнага аб'яднання ...................................... . Ён нарадзіўся ў 1936 годзе ў ......................................... . Гэта (хто) ......................................... , ........................................... . Дэбютаваў на старонках .............................................. ў 1956 годзе. Аўтар зборнікаў твораў .............................................. , ............................................, ................................................ .

**Zadanie 4.** *(5 p.)*

Прачытай твор Кандрата Крапівы і зрабі практыкаванні згодна з патрабаваннямі.

Ганарысты Парсюк

Бывае, праўда вочы коле...
Раз гнаў пастух свіней у поле.
Адзін вялізарны Парсюк,
Які абегаў вёску ўсю,
За раніцу абшнырыў завуголле,
Цяпер такі меў выгляд важны,
Што носа не дастаць і сажнем –
Вышэй за ўсіх ён сам сябе лічыў,
А што ў самога на лычы,
Не бачыў гэтага, аднак.
І вось адзін тут Падсвінак,
Які заўважыў бруд раней,
І кажа: – Дзядзечка, твой лыч у брудзе!
Нязграбна гэта й між свіней,
А што ж, калі заўважаць людзі?
Парсюк наставіў хіб, Парсюк раз'юшан:
- Цераз цябе я чырванець прымушан!
Такое мне сказаць асмеляцца нямногія,
Дык гэта ж – дэмагогія! –
Парсюк наш лаецца, не даравяць клянецца:
- І месца мокрага, - крычыць, - не застанецца!
Ты мой свінячы гонар закрануў! –
І так ён Падсвінака грызянуў,
Што той за сажняў пяць адскочыў.
Парсюк не надта быў ахвочы
Глядзецца праўдзе ў вочы.

Назаві чатыры характэрныя рысы твора.

- .......................................................................................................................................
- .......................................................................................................................................
- .......................................................................................................................................
- .......................................................................................................................................

Растлумач апошнія два радкі твора.

...........................................................................................................................................................

...........................................................................................................................................................

**Zadanie 5.** *(2 p.)*

Растлумач поўнымі сказамі сэнс параўнанняў, якія акрэсіваюць „беларускае слова" ў мініяцюры Сакрата Яновіча.

Ты, як дзяцінства, ідзеш за мною.

........................................................................................................................................

Ты, як сябар шчыры, не пакінеш у няшчасці.

........................................................................................................................................

**Zadanie 6.** *(6 p.)*

***

Бацькаўшчына, зямля дарагая,
дзе лёс дазволіў роду ўзысці.
Ніхто з нас бацькаўшчыны не выбірае,
як не выбірае маці ў жыцці.

Любім такую, як нас нарадзіла
і ўскалыхала прасторай зямлі.
Усё на ёй наша, усё на ёй міла
карэннем, таму што ў яе мы ўраслі.

Куды б ні закінуў лёс вернага сына,
у свеце ён родных не знойдзе братоў.
Моцна трымае зямлі пупавіна
сэрцы людскія і кліча дамоў.

Выкарыстоўваючы верш Ларысы Геніюш выканай заданні.

Чым для лірычнага „я” з'яўляецца Бацькаўшчына? Адкажы прынамсі трыма сказамі.

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

.................................................................................................................................................

Выпішы з твора мастацкія сродкі вобразнасці.

- эпітэт (1) - .....................................................................................................................

- метафара (1) - ................................................................................................................

- параўнанне (1) - ..............................................................................................................

**Zadanie 7.** *(3 p.)*

Дапасуй від стылю да адпаведнага тэксту.

<u>Віды стыляў</u>: мастацкі, гутарковы, публіцыстычны.

- Дождж зараз пойдзе.
- Не, не пойдзе.
- Кажу табе, пойдзе.
- А я табе – не.
- Не злуй мяне, чуеш.

Гэта стыль .......................................................................................................................

Люблю наш край – старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.
Люблю народ наш беларускі,
Хаціны ў зелені садоў,
Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў.

Гэта стыль .......................................................................................................................

Басовішча – вось дзе сапраўднае свята беларускай рок-музыкі! Штогод недалёка ад польска-беларускай мяжы, у прыгожым сасновым гаі ля мястэчка Грудэк на Беласточчыне, збіраецца моладзь дзвюх краін, каб паслухаць любімых выканаўцаў. У гэтым годзе фестываль-конкурс быў дваццаць чацвёрты, і пэўна адзін з лепшых.

Гэта стыль ....................................................................................................................

**Zadanie 8.** *(8 p.)*

Перакажы ў васьмі сказах змест урыўка апавядання Максіма Гарэцкага „Усебеларускі з'езд 1917-га года”.

- Быў гэта апошні дзень з'езду. Позна ўжо, ноч, а ў нас у тым тэатры ну вось якраз, як на вялікадні ў царкве. Неяк і радасна, і сумна, (...). Гэта ж не жарты: рэспубліку сваю, Беларусь няшчасную, на ногі ставім, зараз правіцельства народнае выбіраць будзем ... Аж тут і крыкні нехта: бальшавікі прыехалі нас разганяць. Што за ліха, - думаем сабе, - (...) контррэвалюцыянераў сярод нас няма: усё мужыкі, салдаты (...). Не дадзімся, думаем сабе! Аж там цэлая бойка! Схапіліся нашы салдаты з тымі, што з'явіліся разганяць. (…) Бачу я, што тут жа (...) бароніцца тая дэлегатка, бойкая дзяўчына, такія размовы на з'ездзе казала, што прост за сэрца хапала. (…) Кінуліся салдаты на дзяўчыну (...). Павалілі, б'юць (...). Прапала нашая справа, трэба ратавацца, уцякаць. (…) Тут мяне злавілі і пагналі з другімі арыштаванымі ў нейкі склеп. Праседзелі мы ноч. (...) Беларусь няшчасная!– думаем сабе (...) Не падняцца табе на свае ногі, бедная ..

- Цяпер! (...) Як жа ёй не быць? Не мы, дык нашы дзеці паднімем-ткі яе на свае ногі.

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..................................................................................................................................

**Zadanie 9.** *(8 p.)*

Дзеяслоў бегчы пастаў у патрэбнай форме цяперышняга часу.

1. Сцежка (бегчы) ............................. у лес. 2. Я хутка (бегчы) .................................. дадому, бо будзе дождж. 3. Кроў (бегчы) .................................. па жылах. 4. Мы з сяброўкай (бегчы) .................................... у школу. 5. Дні (бегчы) ...................................., мінаюць. 6. Чаго ты так (бегчы) ..................................? 7. Ты (бегчы) ................................ так, што і дагнаць няпроста.
8. Яна (бегчы) .................................... у краму па малако.

**Zadanie 10.** *(8 p.)*

Ад колькасных лічэбнікаў утвары парадкавыя або ад парадкавых колькасныя.

Адзін ............................................................
...................................................... пяты
Дзесяць ............................................................
...................................................... дванаццаты
Трыццаць ............................................................
...................................................... пяцідзесяты
Сто ............................................................
...................................................... дваццаць шосты

**Zadanie 11.** *(8 p.)*

Устаў на месцы кропак, дзе трэба, апостраф або мяккі знак.

1. Вецер кідаў і кідаў раз...юшаныя хвалі на борт карабля. 2. Спеў ад сэрца л...ецца. 3.Снег разгул...ваў па панадворку як гаспадар. 4. Мая сям...я вялікая. 5. Хутка з...ем снеданне і пайду ў школу. 6. Гэтае вандроў…е мяне вельмі змучыла. 7. На стаўбе вісіць цікавая аб...ява. 8. У нашым горадзе пабудавалі вялікі павіл...ён.

**Zadanie 12.** *(8 p.)*

На месцы кропак напішы адпаведную прыстаўку: з / с, раз / рас, без / бес, пад, ад, аб.

1. У паветры была страшная духата – нібыта ...біралася на дождж. 2. Нерухома стаялі каля дарогі ра...кацістыя дубы. 3. Пажоўклы мох бя...шумна п'е ваду. 4. Я ляжу і гляджу ў бя...межны блакіт неба. 5. Ра...галістыя сосны раскінуліся на пясчаным узгорку. 6. А...шумелі ліпеньскія дажджы, навальніцы ў полі а...гулі. 8. На тым а...шары красавала збожжа.

**Zadanie 13.** *(6 p.)*

Перакладзі сказы на польскую мову.

Беларусь вельмі доўга змагалася за сваю незалежнасць.

..................................................................................................................................................

Быў гэта цяжкі і складаны шлях.

..................................................................................................................................................

У гэты час загінула многа нявінных людзей.

..................................................................................................................................................

На вялікую ўвагу заслугоўваюць беларускія пісьменнікі і палітычныя дзеячы.

..................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................

Гэта дзякуючы ім беларусы не страцілі надзеі на лепшае заўтра.

..................................................................................................................................................

25 сакавіка 2018 года будзем адзначаць сотую гадавіну паўстання Беларускай Народнай Рэспублікі.

..................................................................................................................................................

..................................................................................................................................................

---

**BRUDNOPIS (nie jest oceniany)**